МАЙСТЭРНЯ НАСТАЎНІКА

**І. Л. Селівёрстава**

# Літаратурнае чытанне

## 2 клас

## *Дыягнастычныя матэрыялы*

*Дапаможнік для настаўнікаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з рускай мовай навучання і выхавання*

Мінск
«Сэр-Віт»
2025

# Прадмова

Неад’емнай часткай арганізацыі навучання па літаратурным чытанні з’яўляецца праверка ўзроўню сфарміраванасці чытацкіх уменняў вучняў. У сувязі з гэтым настаўнік перыядычна праводзіць кантроль вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў, які ажыццяўляецца пасля вывучэння раздзелаў (тэм) вучэбнага дапаможніка з мэтай абагульнення і сістэматызацыі чытацкіх уяўленняў і ведаў вучняў па вывучанай тэме і дыягностыкі ўзроўню развіцця чытацкіх уменняў вучняў. Кантроль можа праводзіцца з дапамогай франтальнага вуснага апытання або ў пісьмовай форме з выкарыстаннем дыдактычных заданняў.

Заданні, прапанаваныя ў дапаможніку, прадстаўлены сістэмна, па раздзелах, якія суадносяцца з тэматыкай раздзелаў вучэбнай праграмы па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура (літаратурнае чытанне)» для II класа. Кожная работа прадстаўлена ў двух варыянтах.

Адрасуецца настаўнікам.

# Колеры года. Восень

## Варыянт 1

**1.** У вершы Веры Вярбы «Восень» дзеці запрашаюць восень:

а) на вуліцу;
б) у школу;
в) дамоў;
г) у горад.

**2.** Які вадаём паслужыў люстэркам восені з апавядання Міхася Даніленкі «Па лясах і палях»?

а) Акіян;
б) рэчка;
в) мора;
г) возера.

**3.** Жураўлі ў вершы Якуба Коласа «Адлёт жураўлёў» ляцяць:

а) роўненькім шнурочкам;
б) па адным;
в) клінам;
г) па два.

3. Прачытай уважліва радкі верша Ніны Галіноўскай «Хто жыве ў траве?»:

Непаседа … –
то наперад, то назад.
Кружыцца, як верталёт.
Не патрэбен ёй пілот.

♦ Устаў патрэбнае слова:

а) божая кароўка;
б) пчолка;
в) страказа;
г) павучок.

4. У творы «Гаспадар пушчы» Віталь Вольскі параўноўвае маленькіх зубранят з:

а) птушанятамі;
б) медзведзянятамі;
в) вавёркамі;
г) ваўчанятамі.

5. Алесік з казкі Генадзя Аўласенкі «Сказ пра тое, як Алесік заблукаў аднойчы ў лесе» не згадзіўся застацца ў лесе, бо:

а) трэба дапамагаць бацькам;
б) сумаваў без сяброў;
в) трэба рыхтаваць урокі;
г) мама будзе хвалявацца.

# Урокі жыцця

## Варыянт 1

**1.** Прачытай уважліва наступныя радкі:

Устане рана хлебапёк,
Адчуе смачны пах,
І пойдзе жытні свежы хлеб
З румянцам на шчаках.

♦ З якога твора ўзяты гэтыя радкі?

а) Янка Купала «Хлопчык і лётчык»;
б) Уладзімір Карызна «Самая лепшая»;
в) Максім Танк «Жук і слімак»;
г) Эдзі Агняцвет «Хто пачынае дзень?».

**2.** Хто з'яўляецца героямі апавядання Івана Муравейкі «Куплёная груша»?

а) Змітрок і Юрка;
б) Васілёк і Юрка;
в) Змітрок і Янка;
г) Васілёк і Змітрок.

3. Чым быў заняты Пеця з апавядання Васіля Хомчанкі «Самы лепшы малюнак»?

а) Падмятаў падлогу, чысціў дываны;
б) чытаў кнігу, мыў посуд;
в) сядзеў за сталом і маляваў;
г) рыхтаваў урокі.

4. Якая прыказка падыходзіць да казкі Вацлава Ластоўскага «Варона і рак»?

а) Скажы мне, хто твае сябры, я скажу, хто ты сам.
б) Які майстар, такая і работа.
в) Не так лёгка зрабіць, як сказаць.
г) Гультая зямля не любіць.

5. Якая прыказка падыходзіць да верша Уладзіміра Карызны «Самая лепшая»?

а) Маці, што кветка: дзе яна ёсць, там і водар.
б) Ад добрай маткі не бегаюць з хаткі.
в) Кожнаму сваё дзіця міла.
г) І сава сваіх дзяцей хваліць.

б) зусім розныя, супрацьлеглыя па характары;
в) працавітыя і адказныя;
г) аднолькавага колеру.

5. Складзі і запішы невялікае апавяданне на тэму «Адпачынак маёй мары».

## Варыянт 2

1. Хто з'яўляецца аўтарам твора «Чэрвень і Сонейка»?

а) Клаўдзія Каліна;
б) Фама Рамашка;
в) Мар'ян Дукса;
г) Іван Муравейка.

2. Што падарыў хлопчык Святланцы з апавядання Фамы Рамашкі «Слёзы лілеі»?

а) Рамонкі;
б) фіялкі;
в) ружы;
г) лілеі.

3. Кропелькі рачной вады, якія сцякалі з пялёсткаў лілей у апавяданні Фамы Рамашкі «Слёзы лілеі», параўноўваюцца з:

а) кавалачкамі шкла;
б) слёзамі;
в) кропелькамі расы;
г) брыльянтамі.

4. Якая прыказка падыходзіць да казкі Цёткі «Гутарка асоту з крапівою»?

а) Усюды добра, а дома лепей.
б) Сам сябе не хвалі, няхай людзі пахваляць.
в) Праца чалавека корміць, а лянота порціць.
г) У сваім краі, як у раі.

5. Складзі і запішы невялікае апавяданне на тэму «Мае прыгоды летам».